ных отношений, профилактику и устранение конфликтов, формирование оптимальных малых групп (отделов и других подразделений, члены которых психологически хорошо совместимы).

Традиционно к административным методам работы относят и организационные: моделирование структуры редакции и работы коллектива, стратегическое и текущее планирование деятельности редакции, координация взаимодействия различных структурных подразделений и отдельных сотрудников, нормирование труда работников и учет его результатов, контроль и проверка исполнения. Использование всего комплекса методов административного управления позволяет достигнуть оптимальных результатов в деятельности редакции.

Оценивая роль административного менеджмента в системе современных технологий управления медиакомпанией, следует отметить, что наряду с эвристическим, инновационным и другими наиболее актуальными направлениями развития теории и практики управления школа административного менеджмента продолжает занимать центральное место в обеспечении эффективного функционирования системы массовой коммуникации.

*Литература*

1. Гуревич, С. Газета: вчера, сегодня, завтра : учеб. пособие / С. Гуревич. – М. : Аспект Пресс, 2004. – 288 с.
2. Понятие и виды методов управления // NewInspire [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://newinspire.ru/l/3/33/759-ponyatie-i-vidy-metodov-upravleniya.html. – Дата доступа : 01.09.2017.

**Наталля Зубчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ГАЗЕТА «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» У КАНТЭКСЦЕ ПАДЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны пачалася перабудова дзейнасці друкаваных сродкаў масавай інфармацыі. Узніклі праблемы з выпускам і распаўсюджваннем газет і часопісаў. 24 чэрвеня 1944 г. у выніку бамбардзіроўкі Мінска была разбурана друкарня «Звезда», у якой друкавалася большасць рэспубліканскіх газет. На непрацяглы час іх выпуск быў пераведзены ў абласныя друкарні. Аднак даволі хуткае наступленне нямецкіх войскаў вымусіла спыніць  выхад галоўных рэспубліканскіх газет «Звязда» і «Советская Белоруссия», а таксама іншых выданняў.

21 верасня 1941 г. ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб выхадзе газеты «Савецкая Беларусь» – органа ЦК і Мінскага абкама КП(б)Б. Першы нумар быў надрукаваны ў Арле 9 кастрычніка 1941 г. Праз некаторы час выданне было пераведзена ў Казань, а з 1942 г. газета стала друкавацца ў Маскве ў друкарні «Известия» [1, с. 272–273].

Па сутнасці, у перыяд Вялікай Айчыннай вайны «Савецкая Беларусь» замяніла «Звязду». Першы выпуск газеты меў двайную нумарацыю № 1 (7101 – чарговы нумар «Звязды»). Спачатку газета друкавалася на дзвюх палосах, пазней на чатырох. Перыядычнасць складала 1 раз на тыдзень. У 2-й палове 1942 г. колькасць нумароў павялічылася ў сярэднім да 10 разоў у месяц. Да 1943 г. газета выходзіла на беларускай мове.

Вакол выдання аб’ядналіся лепшыя літаратурныя і прафесійныя журналісцкія сілы. Творы класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы і Я Коласа, а таксама А. Астрэйкі, М. Машары, К. Чорнага, П. Броўкі, А. Кучара, М. Танка, А. Бялевіча, П. Глебкі, К. Крапівы і многіх іншых складалі аснову публіцыстычнага зместу газеты. У цяжкі  час вайны лепшыя прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі змагаліся разам з усім народам, сваімі творамі ўмацоўвалі патрыятычны дух. У № 8 ад 11.01.1942 быў апублікаваны «Кліч да беларускага народа» Я. Купалы, у № 26 ад 05.03.1942 змешчаны зварот Я. Коласа «Да зброі, беларускі народ!».

З заклікам змагацца за Радзіму да грамадзян акупіраванай Беларусі са старонак газеты звярталіся кіраўнікі ўрада: сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка (прамова «Беларускі народ у барацьбе з нямецкімі акупантамі», СБ, № 1 ад 16.01.1942), зварот «Да працоўных Беларусі» ад ЦК КП(б)Б, СНК, Прэзідыума ВС БССР (№ 32 ад 27.03.1942) і інш.

Першыя выпускі газеты нагадвалі лістоўкі. Іх змест складалі патрыятычныя вершы, лозунгі (кожны нумар адкрываўся лозунгам), кароткія апавяданні аб подзвігах партызан і падпольшчыкаў, фотарэпартажы, інфармацыйныя зводкі «Ад савецкага інфармбюро», карэспандэнцыі аб працы на заводах, прамовы членаў ЦК Сталіна, Варашылава. Матэрыялы друкаваліся ў рубрыках «Баявыя весткі», «Тэлеграмы з-за граніцы», «Баявыя эпізоды», «Наступленне Чырвонай Арміі», «У тыле ворага», «Дзейнасць партызан Беларусі», «Па Савецкаму Саюзу» і інш.

Паступова змест газеты станавіўся больш разнастайным, рэдакцыя выкарыстоўвала новыя жанры, метады і формы публіцыстычнага ўздзеяння, якія сведчылі аб нарастанні ўсенароднай барацьбы. У некалькіх выпусках за студзень 1942 г. была надрукавана інфармацыя пра радыёмітынг прадстаўнікоў беларускага народа, які адбыўся 18

студзеня 1942 г., а таксама зварот да Сталіна ад імя беларускага народа (№ 10 ад 20.01.1942).

З'яўляючыся па сутнасці адзінай афіцыйнай крыніцай інфармацыі на тэрыторыі Беларусі аб ходзе ваенных дзеянняў, газета адлюстроўвала агульны грамадскі настрой. Выпускі першых месяцаў складаліся ў асноўным з матэрыялаў інфармацыйна-заклікавага зместу. Адчуванне разгубленасці, страху і нават няўпэўненасці перадавалася праз радкі, нягледзячы на вялікую колькасць патрыятычнай інфармацыі. Адчуванне безвыходнасці падмацоўвалася публікацыямі, фотаздымкамі аб зверствах фашыстаў сярод мірнага насельніцтва.

Першая вялікая перамога Савецкай арміі ў бітве пад Масквой умацавала надзею на перамогу. Пералом адбыўся і ў змесце «Савецкай Беларусі»: з'явіліся новыя рубрыкі («Дапамога насельніцтву вызваленых раёнаў», «Беларусы на фронце», «На франтах Айчыннай вайны», «Вызваленчы дух пашыраецца»). Газета павялічыла аб'ём да чатырох палос, пачала змяшчаць фотаздымкі. З'явіліся публікацыі аб панічных настроях салдат, разлажэнні нямецкай арміі (СБ, № 21 ад 16.02.1942), што, безумоўна, садзейнічала ўмацаванню баявога духу арміі і насельніцтва акупіраванай Беларусі.

Асаблівай увагі ў дадзеным кантэксце заслугоўваюць рубрыкі аб героях Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта са старонак «Савецкая Беларусі» народ упершыню даведаўся пра подзвігі Льва Даватара, Мікалая Гастэлы, Фёдара Паўлоўскага, Жэні Палтаўскай, Сашы Тышкевіча (№ 20–21 ад 16.02.1942) і многіх іншых нашых землякоў. Веру ў перамогу над фашызмам зламаць ужо было немагчыма. З кожным новым выпускам газета паведамляла, як да барацьбы з ворагам далучаюцца новыя сілы і ў гэтым магутным патрыятычным змаганні за будучыню народ ажывае, наладжвае побыт, верыць у хуткае вызваленне. Набываў вялізныя маштабы партызанскі рух, часцей гучаў заклік «Беларусы! Узнімайцеся на ўсенародную партызанскую барацьбу!» (№ 38 ад 17.04.1942). У № 43 ад 04.05.1942 было надрукавана адкрытае пісьмо партызан Калінінскага фронту І. В. Сталіну.

Свой уклад у справу перамогі рабілі вучоныя Беларусі, пісьменнікі і паэты, мастакі: у № 29 ад 14.03.1942 газета змясціла інфармацыю аб сесіі Акадэміі навук БССР у Казані, у № 32 ад 27.03.1942 выйшлі матэрыялы «Беларускія літаратары ў дні вайны», «Новыя творы беларускіх пісьменнікаў» і «Беларускія вучоныя за працай».

Знакавай падзеяй для беларусаў стаў выхад у эфір радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» 30 сакавіка 1942 г. У гэты ж дзень газета змясціла

паведамленне пад назвай «Слухай, беларускі народ». Радыёстанцыя працавала ў Маскве і выходзіла ў эфір на беларускай мове на хвалі 41,5 м (СБ, № 33).

Насельніцтва акупіраванай Беларусі выступала супраць зямельнай рэформы. У шматлікіх публікацыях за 1942 г. раскрывалася сутнасць акупацыйнай палітыкі, калабаранцкага руху (артыкул «Пратэст беларускіх сялян супраць гітлераўскай “зямельнай рэформы”», № 40 ад 23.04.1942).

Міжнародны аддзел «Савецкай Беларусі» складаўся з паведамленняў аб нарастанні антыфашысцкай барацьбы ва ўсім свеце. У матэрыялах газеты расказвалася аб галодных бунтах у Германіі, разгроме італьянскай дывізіі югаслаўскімі партызанамі, бунтах сялян і салдат у Чэхаславакіі (СБ, № 33 ад 30.03.1942). У № 55 ад 16.06.1942 была змешчана інфармацыя аб падпісанні «Дамовы паміж СССР і Вялікабрытаніяй аб саюзе ў вайне супраць гітлераўскай Германіі і яе саўдзельнікаў у Еўропе і аб супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе пасля вайны». 26 чэрвеня 1942 г. народны камісар замежных спраў В. Молатаў наведаў Вашынгтон. На наступны дзень у газеце з’явілася інфармацыя аб выніках перамоў.

Такім чынам, к 1942 г. рэдакцыяй «Савецкай Беларусі» была сфарміравана канцэпцыя ваеннага выдання. Пастунова палепшыўся дызайн: сталі выкарыстоўвацца новыя шрыфты, больш якаснымі былі ілюстрацыі, асобныя святочныя нумары друкаваліся ў колеры. Газета актыўна публікавала вершы, апавяданні, у якіх услаўляўся подзвіг народа, лісты салдат і партызан з заклікам змагацца да пераможнага канца.

З 22 лютага 1943 г. «Савецкая Беларусь» пачала друкавацца на беларускай і рускай мовах. Пасля вызвалення Мінска ў жніўні 1944 г. яна спыніла сваю дзейнасць. На рускай мове пачала выходзіць ізноў газета «Советская Белоруссия» і на беларускай – «Звязда».

Гістарычнае значэнне дзейнасці перыядычных выданняў у гады Вялікай Айчыннай вайны проста каласальнае, і пераацаніць яго немагчыма. Высокі ўзровень публіцыстычнага майстэрства, прафесіяналізму ў найскладанейшых умовах акупацыі, духоўнага крызісу дазволіў рэдакцыі «Савецкай Беларусі» выканаць вельмі значную працу па кансалідацыі грамадства, выхаванні патрыятычнай свядомасці насельніцтва краіны.

*Літаратура*

1. Марцелев, С. В. Печать Советской Белоруссии (исторический очерк) / С. В. Марцелев. – Минск : Беларусь, 1967. – 512 с.